***В.М. Шавель***
БарДУ (Баранавічы)

# ВЫХАВАННЕ ПРАЗ ПРЭВЕНТЫЎНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

Існуючая практыка прафілактычнай дзейнасці ў напрамку выхавання часта працягвае грунтавацца пераважна на адміністратыўна-аўтарытарных падыходах да асобы як аб'екта выхавання, накіраванага на пераадоленне негатыўных з'яў, а не на іх папярэджанне.

Улічваючы недахопы папярэдняй практыкі рэалізацыі прафілактычных задач, асноўная ўвага павінна быць накіравана на выпрацоўку новай філасофіі выхавання. Выхаваўчая дзейнасць павінна ажыццяўляцца з улікам сітуацыі жыццядзейнасці дзяцей і моладзі, існуючых у грамадстве рэсурсаў, магчымасцей, а таксама міжнародных праграм і фондаў.

Адзін са шляхоў, па меркаванні прыхільнікаў прэвентыўнай педагогікі, — далучэнне да этыкетнай культуры — гэта ўступленне ў сацыя-педагагічны і культурна-этнічны ансабль, дзе кожны суб'ект жадае быць пададзены ўласным голасам і свядомасцю.

Навучанне этыкетным паводзінам павінна ўваходзіць ва ўсе выхаваўчыя праграмы школ і вузаў. Выкладацца павінны правілы паводзін у грамадстве, разнастайных месцах правядзення адпачынку. Асаблівую ўвагу варта ўдзяляць этыкету ў навучных установах акадэмічнай накіраванасці.

Захаванне рытуалаў, прытрымліванне народных звычаяў, павага традыцый, да дзяржаўных сімвалаў павінна ўваходзіць у змест этыкетнай культуры будучага педагога і выкладчыка, які працуе.

Школа этыкету мае на мэце арыентацыю на тыя месцы, дзе мы нарадзіліся. Беларускі этыкет адрозніваецца ад рускага і ўкраінскага: беларусы больш стрыманыя, функцынальныя, этыкетныя. Асаблівасцей у этыкетнай культуры беларусаў мноства, і іх трэба мець на ўвазе выкладчыку, які працуе ў беларускай навучальнай установе.